А. Л. Загурская
Т. А. Няборская

Мой рабочы сшытак

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

## Рабочы сшытак

## 2 клас

Дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

Мінск
"Адукацыя і выхаванне"
2021

## ДАРАГІ СЯБАР!

Сшытак, што ты трымаеш у руках, дапаможа табе працаваць па падручніку "Літаратурнае чытанне". На яго старонках шмат цікавых пытанняў і заданняў да твораў. Каб выканаць іх, табе неабходна будзе чытаць, думаць, разважаць, выказваць свае меркаванні; складаць план твора, пераказваць яго, прыдумваць невялічкія вершы, пісаць, маляваць, разгадваць крыжаванкі і рэбусы.

Прапанаваныя заданні ты можаш выконваць самастойна ў класе ці дома, з дапамогай настаўніка ці бацькоў.

**Умоўныя абазначэнні:**

? — пытанні;

— заданні;

* — заданні павышанай цяжкасці;

— заданні для парнай і групавой работы.

## Бывай, лета!

*Паўлюк Пранузa*

**1.** Прачытай верш Паўлюка Пранузы. Падкрэслі словы, якія перадаюць твой настрой пасля чытання верша.

**Кепскі, радасны, святочны, казачны, сонечны, бадзёры, разгублены, трывожны, вясёлы, цудоўны, чароўны, крыўдлівы.**

? Абгрунтуй свой выбар.

**2*.** Якія поры года ты ведаеш? Пачні з лета і запішы іх у правільным парадку.

______________________________________________

______________________________________________

**3*.** Разгадай рэбус. Запішы адказ.



\+



______________________

1, 2 1, 2



## Восень на парозе

*Паводле Уладзіміра Ягоўдзіка*

**1.** Успомні прыкметы восені. Прачытай прапанаваныя словы і выразы. Падкрэслі тыя, што можна выкарыстаць, каб апісаць восень.

**Вырай, ледзяшы, дождж, апалае лісце, доўгі дзень, багаты ўраджай, грыбы, ягады, маленькія птушаняткі, парасон, ручайкі, першае верасня.**

**2.** Збяры прыказку, якая сустракаецца ў тэксце. Запішы яе.




______________________________________________

______________________________________________

? Які сэнс прыказкі?

## Шкадаванне

*Паводле Алеся Бадака*

**1.** Прачытай выразы, з дапамогай якіх Алесь Бадак апісвае бусла.

**шух-шух!**
**зусім нізка праляцеў**
**цыбатыя ногі**
**апусціўся на луг**
**ногі ў траве перастаўляе**
**доўгая дзюба**
**быццам па вадзе ідзе**
**як кап'ё**
**велічная, прыгожая птушка**

З дапамогай гэтых слоў раскажы пра сустрэчу аўтара з буслом.

**2*.** Разгадай рэбус. Запішы адказ.



1 = Б НЬ = Л



## Гаспадар пушчы

*Віталь Вольскі*

**1.** Прачытай сам сабе радкі твора.

**"Трашчыць галлё. З шумам і фырканнем прадзіраецца з непраходнага гушчару нешта вялікае і дужае".**

**"Прагна ўглядваюся я ў ляснога волата. Не часта даводзіцца бачыць такое відовішча".**

**"У ясным і ціхім лясным паветры выразна чуецца роўнае і глыбокае дыханне вялікай жывёлы".**

Падкрэслі словы, з дапамогай якіх аўтар апісвае веліч жывёлы.

**2*.** Разгадай рэбус. Запішы адказ.





1 = Г,
4 = П

КАМ = Д

**2.** Прыдумай або знайдзі ў вершы другую назву для твора. Запішы.

## СУСТРЭЧА З КАЗКАЙ

### Лісіца і Гусак

*Беларуская народная казка*

**1.** Злучы стрэлкамі словы, якія абазначаюць дзеянні, і выяву дзеючай асобы.





**падняўся ў паветра**
**махаў крыламі**
**засмуціўся**
**засталася з разяўленым ротам**
**паляцеў**
**пераступаў з нагі на нагу**
**злавіла**

**?** Як ты зразумееў выраз **засталася з разяўленым ротам**?

**2.** Прачытай сам сабе ўрыўкі з казкі.

**"Засмуціўся Гусак, а рабіць няма чаго".**

**"Глядзіць Ліса на Гусака і смяецца: "Вось дык Гусак! Вось дык танцор!"**

**"Так і засталася Лісіца з разяўленым ротам".**



## ЗМЕСТ

Колеры года. Восень ........................................ 4
Маёй радзімы дзіўны свет ........................................ 11
Жывая кніга беларускай прыроды ........................................ 22
Колеры года. зіма ........................................ 28
Сустрэча з казкай ........................................ 38
Урокі жыцця ........................................ 43
Клопат пра тых, хто навокал ........................................ 52
Колеры года. вясна ........................................ 62
Сям'я — прытулак дабрыні ........................................ 71
Колеры года. Лета ........................................ 81
Адказы ........................................ 87